## **Як на нашай вуліцы**

Колавы карагод

Як на нашай вуліцы шырокая возяра,
Ой, люлі, вой, люлі, шырокае возяра.[1]
Як на том на возяры серы гусі плавалі.
Як налецеў сіз арол да на сваіх крылышках.
Дай ўхваціў гусачку за залаты пёрышкі,
За залаты пёрышкі, да за бела крылышка.
Як на нашай вуліцы дзеўкі танка вадзілі.
Прыскакаў хлапец на коніку да й ўхваціў дзеўчыну,
Да й ўхваціў дзеўчыну да за русу касаньку,
Да за русу касаньку, да за белу ручаньку.
Як на нашай вуліцы шырокая возяра.

Водзяць па колу, часам змяняючы напрамак руху.

Запісаў Басаў Р.Ц. у 2006 г. у в. Гадзічава ад Зайцавай Анастасіі Нікіфараўны 1926 г.н., Лапека Варвары Агееўны, 1910 г.н., Зайцавай Марыі Іванаўны, 1921 г.н., Лаўровай Марыі Нікіфараўны, 1924 г.н., Басавай Таццяны Сяргееўны, 1934 г.н., Зайцавай Марыі Андрэеўны, 1937 г.н.

[1] Рэфрэн “Ой, люлі, вой, люлі” выконваецца пасля кожнага радка з паўторам яго другой паловы.